УДК 94(476)„1917“

# “ПАГУКАННЕ” І СТАТУТЫ МАГІЛЁЎСКАГА БЕЛАРУСКАГА КАМІТЭТА (КРАСАВІК 1917 г.)

*Агееў Аляксандр Рыгоравіч*
прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ імя А.А. Куляшова, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Магілёў, Беларусь)

*У артыкуле аналізуюцца заклік і статуты Магілёўскага Беларускага Камітэта, якія былі выдадзены ў красавіку 1917 г. і дапамагаюць раскрыць мэты і задачы, праграму дзейнасці першай магілёўскай беларускай арганізацыі рэвалюцыйнага часу. Дакументы напісаны гутарковай мовай прыдняпроўскіх беларусаў і былі разлічаны на рэкрутаванне і яднанне вакол камітэта прыхільнікаў беларускай ідэі.*

Гісторыя Магілёўскага Беларускага Камітэта (МБК) – першай палітычнай нацыянальнай арганізацыі беларусаў Магілёва пачатку XX ст. стала вядома дзякуючы друкаваным успамінам М. Кахановіча [4], публікацыям А. Агеева, Ю. Васілеўскага, У. Ляхоўскага, Д. Лаўрыновіча, І. Пушкіна, С. Рудовіча. Так, пяць гадоў таму на дзясятых Раманаўскіх чытаннях намі ўжо закраналіся пытанні дзейнасці МБК і палітычнага самавызначэння магілёўцаў напрыканцы Першай сусветнай вайны [1]. А ў 2017 г. была апублікавана сумесная з Ігарам Пушкіным манаграфія, якая дастаткова поўна раскрывае дзейнасць камітэта [2].

Прыемным падарункам гэтага года стала знаёмства ў аддзеле рукапісаў Літоўскай цэнтральнай акадэмічнай бібліятэкі Урублеўскага (Lietuvos moksli akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraљčių skurius) з невядомым нам раней дакументам: “Воззваніе и уставы Могілевскаго Белорускаго Комітета. Могилевъ губ. 1917 г.” Яго тэкст “перададзены” беларускай мовай “говараў усходніх уездаў Магілёўскай губерні (Беларусь левабярэжнага Прыдняпроўя)”, як указана ад імя МБК на старонцы № 7 у заўвазе да выдання. Дакумент выдадзены друкарскім спосабам у магілёўскай друкарні Клаза і Кагана. Аб'ём брашуры восем старонак, кошт 10 кап. Верагодны час друку – красавік ці май 1917 г., аб чым сведчыць дата ў канцы выдання: “Красавіка 14 дня 1917 г.” [3]. Тыраж дакумента складаў 2 000 экзэмпляраў, бо рашэнне аб выданні праграмных заяў такім накладам было прынята, як паказана вышэй, 23 красавіка 1917 г. [2, с. 155].

Заклікі і статуты арганізацыі цікавыя ў кантэксце спрэчак аб распрацаванасці праграмы і статута дзейнасці МБК. Аўтарытэтны беларускі даследчык гэтага перыяду С. Рудовіч, які першым у 2001 г. раскрыў у сваім дакладзе агульныя абрысы гісторыі камітэта, рабіў адсылкі да статутаў і даў іх дакладную агульную ацэнку, сцвярджаў, што арганізацыя не мела сваёй *сталай* праграмы [7, с. 204]. Д. Лаўрыновіч у 2011 г. апублікаваў два заклікі і статут МБК у Магілёве [5]. Гэтыя тры дакументы адлюстроўвалі дэкларацыю членаў будучага камітэта аб намерах і перспектывах, але заставаліся пэўны час без належнай увагі. І. Пушкін дастаткова аргументавана аспрэчыў тэзіс аб слаба распрацаванай праграме МБК, даказаў наяўнасць у архівах некалькіх аб'ёмных чарнавікоў праграмных дакументаў камітэта, шкадаваў аб адсутнасці “арыгіналу статута”, сцвярджаў, што “ён практычна без змен, быў пакладзены ў аснову статута *Магілёўскай Беларускай Рады” (студзень 1918 г.)*, машынапісны п*раект якога* захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы (Вільня) [6].

Сумненні ў наяўнасці праграмы, спрэчкі аб арыгінальным тэксце статута і меркаванні аб іх канчатковым змесце заставаліся. З аднаго боку, склад членаў магілёўскага камітэта быў надзвычай грунтоўным. У яго ўваходзілі адукаваныя і паважаныя людзі. Такія асобы маглі займацца не толькі арганізацыйнай дзейнасцю, але і распрацоўкай праграмных дакументаў. Нездарма МБК выдаў у 1917 г. вучэбную праграму па гісторыі беларускага народа, якая па сутнасці з'яўляецца першай навучальнай праграмай гісторыі Беларусі, выдадзенай на тэрыторыі нашай краіны [2, с. 20-21, 35-37, 229-233]. З іншага боку, паколькі рэгіянальныя арганізацыі не павінны былі мець сваіх асобных праграм дзейнасці, бо ўваходзілі ў агульнабеларускія і агульнарасійскія арганізацыі, якія мелі праграмы, то вызначалі накірункі іх дзейнасць заклікі і статуты.

Як указвалася ў ранейшых публікацыях, п*ачатак беларускай нацыянальнай арганізацыі ў Магілёве быў пакладзены сходам “асоб, што прызнаюць сябе беларусамі”*, 23 сакавіка 1917 г., на якім быў у*тораны* Магілёўскі беларускі гурток. У сакавіку-красавіку ў Магілёве адбылася інстытуалізацыя новай грамадскай арганізацыі – Магілёўскага Беларускага Камітэта: *31 сакавіка 1917 г. быў выбраны Беларускі арганізацыйны камітэт у Магілёве* (БАКМ) ; 7 і канчаткова 18 красавіка 1917 г. зацверджаны праект статута; 15 красавіка была пададзена заява на імя губернскага камісара, а 24 красавіка 1917 г. было атрымана пасведчанне аб рэгістрацыі БАКМ [2, с. 17-24].

З мэтай мабілізацыі беларусаў, фарміравання паўнацэннай і аўтарытэтнай арганізацыі трэба было паклікаць – “пагукаць” прыхільнікаў беларушчыны. На рускай мове 14 красавіка ў газеце “Магілёўскі веснік” былі надрукаваны заклік і статут БАКМ [5]. Яшчэ за дзень да атрымання афіцыйнага паведамлення аб рэгістрацыі арганізацыі, 23 красавіка, на “сходцы” камітэта было прынята рашэнне аб друку “пагукання” і статутаў накладам 2 000 асобнікаў.

Адшуканыя ў гэтым годзе “Воззваніе и уставы Могілевскаго Белорускаго Комітета” (заклік і статуты МБК) адрозніваюцца ад раней вядомых арыгіналаў мовай напісання, аб'ёмам і менш значнай розніцай зместу. Яны напісаны рускімі літарамі зразумелай тутэйшаму насельніцтву беларускай мовай і былі накіраваны не толькі да лагічных высноў, але і да пачуццяў патэнцыйных прыхільнікаў. Структурна выданне складаецца з закліку камітэта і яго статута.

Першым у брашуры размешчана “Воззваніе от Могілевскаго Белорускаго Комітета к тым Белорусам, которые спрадвеку жывуть в Могілевщіне”, у якім на простай мове прыдняпроўскіх беларусаў члены камітэта звярталіся да грамадзян-беларусаў: “Росея скінула з сябе тэй давнішній порадок, які́й быв пры царе! Тяперіка Росея вольна!! Тяперь усякій народ, які́й жыве у Росеі, може узять усе, што дае тая воля! Но штобъ получіть тое, што дае воля, – то треба отразу усім нам увойті у обчества по губерням, ті як інш... Вот колі Вы любіте свою родную Белорускую землю, колі Вы хочете увойті у Росейскую Республіку такімі самымі, як і усі іншые народы, дык для етаго Вам треба начать зъединенье усіх, хто еще не одрекся от своей Маткі – Белорусі. Бо ведайте, што толькі у крупной громаде можно сделат тое веліко́е дело, якое маем перед собой. Нам працы ёсць дужо богато! Перш-наперш прогнать треба немцов з нашей землі. Далей, треба выбрать в Учредительное Собраніе самых найлепшіх людзей. Треба обмірковать усе тое дело, што буде решать Учредітельное Собраніе, не забывшы и про свае Белорускіе інтересы. Затым треба усім працавать!.. Но промежду насъ ёсь німала такіх, которые звыклі поузать перед каждым урадніком… Дык кінем мы іх убок! Бо хто звык поузать, тэй ужо ніколі не полетіть, і хто звык подлізыватца, тэй не стане грудью за прауду…” На наступнай старонцы МБК заклікаў беларусаў да “шырокай працы”, прапаноўваў ствараць у гарадах, мястэчках і вёсках такія камітэты, як у Магілёве, пазначыў адрас для перапіскі – Дняпроўскі праспект, 35 [3].

Гэты заклік меншы па аб'ёму, чым апублікаваныя ў газетах заклікі камітэта. Найбольш блізкі яму заклік БАКМ “к коренному вековечному населению Могилевской губернии” (красавік 1917 г.) [5, с. 135-136]. Апошні быў больш аб'ёмным і арыентаваным на інтэлігентную публіку, якая чытае газеты. Па сутнасці, цытаваны намі заклік МБК ёсць скарочаны пераклад на гутарковую мову беларусаў закліка БАКМ.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яшчэ больш падобнымі былі газетны (БАКМ) і брашурны (МБК) варыянты статута. Апублікаваны Д. Лаўрыновічам [5, с. 136–137] і дадзены статут (с. 7-8) супадаюць практычна па ўсіх пунктах. Галоўнымі з'яўляюцца адрозненні ў моўных формулах і акцэнтах. Прычым просты беларускі варыянт больш выразны і канкрэтны.

Параўнанне заклікаў і статутаў Беларускага арганізацыйнага камітэта ў Магілёве і Магілёўскага Беларускага Камітэта паказвае, што яны захоўваюць агульную накіраванасць на адстойванне правоў беларускага народа, але адрозніваюцца аб'ёмам і ў меншай ступені – зместам. Відавочна, што ішла шліфоўка іх палажэнняў, змяняліся акцэнты ў сувязі са зменай палітычнай сітуацыі.

"Воззваніе и уставы Могілевскаго Белорускаго Комітета" напісаны простай мовай прыдняпроўскіх беларусаў і былі разлічаны на рэкрутаванне і яднанне вакол камітэта прыхільнікаў беларускай ідэі не толькі з ліку інтэлігенцыі, але і з сялянства. Калі раней нам падавалася, што члены беларускага камітэта з большага карысталіся ў практычнай дзейнасці рускай мовай, то цяпер становіцца зразумелым, што з самага пачатку яны імкнуліся звяртацца да народа на яшчэ не нармаванай беларускай мове.

Змест "Пагукання і статутаў" не супярэчыць іншым раней апублікаваным або згаданым у публікацыях статутам, але менавіта гэтае выданне, на наш погляд, трэба лічыць асноўным дакументам, які вызначаў дзейнасць арганізацыі ў 1917 г. Менавіта яно найбольш шырока прэзентавала МБК, было надрукавана вялікім накладам. У ім дакладна сфармуляваны задачы і накірункі дзейнасці камітэта. Мэта ж МБК мянялася з часам. Як указвалася намі ў ранейшых публікацыях, палітычныя погляды членаў камітэта эвалюцыянавалі ад мар пра нацыянальную аўтаномію ў складзе Расіі ў 1917 г да падтрымкі незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г. [1]. Нядзіўна, што праект статута 1918 г. быў значна больш грунтоўным і большым па аб'ёме.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Агееў, А. Р. Магілёўскі беларускі камітэт і палітычнае самавызначэнне магілёўцаў напрыканцы Першай сусветнай вайны / А. Р. Агееў, І. А. Пушкін // Романовские чтения – 10, посвященные 80-летию со дня основания исторического факультета : сб. статей Международной науч. конференции / под общ. ред. И. В. Шардыко. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – С. 64-65.
2. Агееў, А. Р. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917–1918) : манаграфія / А. Р. Агееў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – 292 с. : іл.
3. Воззвание и уставы Могилевского Белоруского Комитета. 1917 г. // Lietuvos moksli akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraљčių skurius. – Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літвы. Фонд 21. Спр. 2231. Арк. 97-100.
4. Кахановіч, М. Магілёўцы і незалежнасць Беларусі (мае ўспаміны) / М. Кахановіч // Спадчына. – 1997. – № 6. – С. 3-5.
5. Лавринович, Д.С. История либерального движения в Беларуси начала ХХ в : учебно-методический комплекс / Д.С. Лавріновіч. – Могилев, 2011. – С. 133–137.
6. Пушкін, І. А. Статут і арганізацыйная дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917 год) / І. А. Пушкін // Магілёўшчына. XII выпуск. – Магілёў : Інтэрмікра, 2014. – С. 184–193.
7. Рудовіч, С. У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917–1918 гг. / С. Рудовіч // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / уклад. І.А. Пушкін. – Магілёў: УПКП "Магілёўская абласная узбуйненая друкарня", 2001. – С. 203–209.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова